церкви предполагает их сотрудничество, партнерство в решении насущных общественных задач, а не полную изоляцию друг от друга.

УДК 378.4

## ЭПІСТАЛЯРНАЯ СПАДЧЫНА ФІЛОНА КМІТЫ-ЧАРНАБЫЛЬСКАГА

***Хаданёнак В.М., ст. выкл., Грабовік Т.М., студ.***

*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*
*г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Аршанская зямля па праву можа ганарыцца сваёй гісторыяй, славутымі землякамі. Час захаваў і данёс да нас імя дзяржаўнага і ваеннага дзеяча Вялікага княства Літоўскага, аршанскага старасты Філона Сямёнавіча Кміты-Чарнабыльскага. Знакаміты беларускі пісьменнік У. Караткевіч у віншаванні аршанцам у гонар 900-годдзя заснавання горада, падкрэсліваючы вялікую вартасць літаратурнай спадчыны Філона Кміты, назваў яго "першым сярэдневяковым пісьменнікам Аршаншчыны. Служба ў Оршы дазволіла Ф. Кміце-Чарнабыльскаму рэалізаваць сябе не толькі на вайсковай ніве, але і як дзяржаўна-палітычнага і літаратурнага дзеяча. Літаратурны талент дазволіў выявіць асабістыя якасці, звязаныя са своеасаблівасцю яго погляду на спосаб нясення ўласнай службы: аршанскі староста па сваёй ініцыятыве пісаў лісты, якія са службовымі мэтамі пасылаў у Вільню панам-радзе ВкЛ.

Лісты Кміты-Чарнабыльскага адрозніваюцца тэматычнай разнастайнасцю. У іх можна знайсці звесткі пра пасольствы іншых краін, якія перасякалі землі ВкЛ. Так, у лісце ад 16 чэрвеня 1574 г. да М. Радзівіла аўтар расказваў пра шлях малдаўскага пасла Ісайі, які вяртаўся з Масквы на сваю радзіму. Шмат увагі Кміта-Чарнабыльскі надаваў прыгодам, якія напаткалі паслоў у дарозе. У лісце ад 1 сакавіка 1574 г. распавядаецца пра трагічны канфлікт у Смаленску паміж пасламі рускага цара і месцічамі, які скончыўся раненнямі і забойствамі.

Знаёмячыся з эпісталярнай спадчынай Філона Кміты-Чарнабыльскага, прыходзіш да высновы, што ён добры знаўца фальклору. У сваіх лістах выкарыстоўваў прыказкі, прымаўкі, параўнанні, гумар, сатыру: "...А теж, як доробило лихо, прорежутся и зубы...; ... Ова просто есмо як рыба в омуте: слепи, неведоми! Не ведаем, куды в сию есмо диру влезли!.."; «... Ожегшися на молоце, велено на воду дуть». У сваіх творах, яшчэ за 20 год да Эрыха Лясоты, Кміта-Чарнабыльскі ўзгадвае быліннага волата Ілью Мураўленіна.

Такім чынам, можна з упэўненасцю сказаць, што эпісталярная спадчына Філона Кміты-Чарнабыльскага – гэта сапраўдны скарб. Знойдзеныя дакументы ахопліваюць кароткі адрэзак гісторыі – менш за адзін год (1573-1574). Нягледзячы на гэта,яны надзвычай прыкметная з'ява ў развіцці старажытнай беларускай пісьменнасці. У лістах можна сустрэць шмат этнаграфічных і геаграфічных звестак. Добры знаўца наваколля, аршанскі стараста ўпамінае шмат населеных пунктаў, рэк, азёр. Многія з іх існуюць і сёння.